КОНТРОЛЬНЫЙ
ЭКЗЕМПЛЯР

Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка"

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
_______________ У.У. Шлыкаў
09.06
_______________
Рэгістрацыйны № УД-26-1 / 8-_______/уч.
2017

# Гісторыя Беларусі

Вучэбная праграма установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей:

1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны
1-02 01 02 Гісторыя і сусветная мастацкая культура
1-02 01 03 Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа

2017 г.

Вучэбная праграма складзена на падставе тыпавой вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя Беларусі» для спецыяльнасці 1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны для ўстаноў вышэйшай адукацыі, зацверджанай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь 10.03.2014 г., рэгістрацыйны № ТД–А.465/тып., адукацыйных стандартаў вышэйшай адукацыі І ступені па спецыяльнасцях 1-02 01 02 Гісторыя і сусветная мастацкая культура і 1-02 01 03 Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа (зацв. Пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 25.07.2016 №69

**Складальнікі:**
Вялікі А.Ф. загадчык кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
Дзічкоўская Л.Э. дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
Канапацкая З.І. дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў , кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
Касовіч А.В. дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
Сакалоў М.М. дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**
Кафедрай гісторыі Беларусі і славянскіх народаў

(Пратакол № 9 ад 28.03.2017 г.)

Загадчык кафедры А.Ф. Вялікі

Навукова-метадычным саветам БДПУ
(Пратакол № 4 ад 11.04.2017 г.)

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджаючых яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае
Метадыст вучэбна-метадычнага
упраўлення БДПУ Г.В. Вінаградава

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Тысячагадовая гісторыя Беларусі ўяўляе важную складовую частку славянскай, еўрапейскай і сусветнай цывілізацый і займае вядучае месца ў сістэме гуманітарнай падрыхтоўкі студэнцкай моладзі нашай краіны. Сваёй непаўторнай, гераічнай і трагічнай гісторыяй беларускі народ можа ганарыцца. Менавіта на гістарычных ведах фарміруецца нацыянальная свядомасць. Без ведаў сваёй гісторыі немагчыма будаваць сучаснае краіны і прагназаваць яе развіццё на будучае.

Гісторыя Беларусі вывучаецца сінхронна з краязнаўствам і этналогіяй Беларусі, крыніцазнаўствам гісторыі Беларусі, археалогіяй Беларусі, гісторыяй усходніх славян (Расія і Украіна) і гісторыяй грамадска-палітычнай думкі Беларусі, што дае магчымасць акцэнтаваць увагу студэнтаў на міждысцыплінарных сувязях, выявіць ролю і месца нашага народа ў шырокім прасторавым і часовым дыяпазоне.

**Мэтай** вывучэння вучэбнай дысцыпліны з'яўляецца фарміраванне ў студэнтаў фундаментальных ведаў па гісторыі Беларусі ад першабытных часоў да станаўлення сувярэннай беларускай дзяржавы, і выхаванне на гэтай аснове пачуцця прыналежнасці да лёсу краіны і яе гісторыі.

Для рэалізацыі вызначанай мэты прадугледжваецца вырашэнне наступных **задач**:

- высвятленне прычынна-выніковых сувязей і заканамернасцей гістарычнага развіцця беларускага народа ў кантэксце еўрапейскай і сусветнай гісторыі;
- усведамленне студэнтамі сістэмы матэрыяльных, культурных і духоўных каштоўнасцей беларускага народа, якія служаць рэтраспектывай для аналізу сучаснасці і вызначэння перспектыў будучай жыццядзейнасці;
- атрыманне тэарэтычных і практычных ведаў, якія дазволяць студэнтам правільна аналізаваць падзеі і факты гісторыі, рабіць неабходныя высновы і абагульненні;
- фарміраванне гатоўнасці выпускніка вышэйшай школы як грамадзяніна
- Рэспублікі Беларусь спрыяць далейшаму развіццю сваёй краіны.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен
**ведаць:**

- асноўныя падзеі і факты ў гісторыі Беларусі;
- асаблівасці эканамічнага, сацыяльнага, палітычнага і культурнага развіцця Беларусі ў канкрэтна-гістарычны перыяд;
- этапы фарміравання беларускай народнасці і нацыі, станаўлення і развіцця беларускай дзяржаўнасці.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен
**умець:**

- выкарыстоўваць метадалогію гістарычнай навукі для аналізу гістарычнага развіцця беларускага народа;

– выяўляць асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця беларускай нацыі ў канкрэтна-гістарычныя перыяды;
– выкарыстоўваць гістарычны вопыт для аналіза і ацэнкі сучасных праблем у развіцці Беларусі.

-Увыніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен
**валодаць:**
– спосабамі адбору сістэматызацыі гістарычнай інфармацыі:
– метадамі, формамі і сродкамі аптымізацыі, рацыяналізацыі і інтэнсіфікацыі адукацыйнага працэсу.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Гісторыя Беларусі” павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў наступных акадэмічных і прафесійных кампетэнцый.

Патрабаванні да акадэмічных кампетэнцый:
– АК-1. Умець прымяняць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.
– АК-2. Валодаць метадамі навукова-педагагічнага даследвання.
– АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі.
– АК-4. Умець працаваць самастойна.
– АК-5. Быць здольным параджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

Патрабаванні да прафесійных кампетэнцый:
– ПК-1. Кіраваць вучэбна-пазнавальнай і вучэбна-даследчай дзейнасцю навучэнцаў.
– ПК-2. Выкарыстоўваць аптымальныя метады, формы і сродкі навучання.
– ПК-3. Арганізоўваць і праводзіць навучальныя заняткі розных відаў і формаў.
– ПК-4. Арганізоўваць самастойную працу навучэнцаў.
– ПК-17. Ажыццяўляць прафесійную самаадукацыю і самавыхаванне з мэтай удасканалення прафесійнай дзейнасці.

Пры вывучэнні кожнай тэмы студэнты павінны навучыцца карыстацца як канкрэтна-гістарычнымі метадамі (гісторыка-генетычным, гісторыка-параўнальным, гісторыка-тыпалагічным, гісторыка-сістэмным і інш.), так і агульнанавуковымі (мадэліравання, індукцыі і дэдукцыі, сінтэзу і аналізу, узыходжання ад канкрэтнага да абстрактнага і наадварот, аналогіі і інш.), метадамі гістарычнага пазнання.

Усяго на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Гісторыя Беларусі” вучэбнам планам адводзіцца для спецыяльнасці 1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны 782 гадзіны, з іх аўдыторных – 300, (лекцыі – 190, семінарскія заняткі – 110). Вучэбная дысцыпліна вывучаецца на 1-4 курсах. На самастойную работу адводзіцца 338 гадзін. Залікі – 1, 3, 7 семестры. Экзамены – 2, 4, 5, 6 семестры. На КСР адводзіцца 8 гадзін. Прадугледжана напісанне курсавой работы. Дадзенная вучэбная дысцыпліна ўключана ў праграму дзяржаўнага экзамена па спецыяльнасці.

Усяго на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Гісторыя Беларусі” вучэбнам планам адводзіцца па спецыяльнасцях 1-02 01 02 Гісторыя і сусветная мастацкая культура і 1-02 01 03 Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа 702 гадзіны, з іх аўдыторных – 300, (лекцыі – 190, семінарскія заняткі – 110). Вучэбная дысцыпліна вывучаецца на 1-4 курсах. На самастойную работу адводзіцца 258 гадзін. Залікі – 1, 3, 7 семестры. Экзамены – 2, 4, 5, 6 семестры. Прадугледжана напісанне курсавой работы. Дадзенная вучэбная дысцыпліна ўключана ў праграму дзяржаўнага экзамена па спецыяльнасці.

На завочнай форме атрымання адукацыі на вучэбную дысцыпліну “Гісторыя Беларусі” па спецыяльнасці 1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны адводзіцца 78 аудыторных гадзін, з іх 48 лекцыйных і 30 семінарскіх заняткаў.

Экзамены – 1, 2, 3, 4 курсах. Залікі – 1, 2, 3 курсах.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Раздзел 1. УВОДЗІНЫ Ў ДЫСЦЫПЛІНУ “ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ”

Гісторыя Беларусі – арганічная і неад’емная частка еўрапейскай і сусветнай гісторыі. Метадалагічныя асновы і прынцыпы вывучэння гісторыі, яе перыядызацыя. Фармацыйны і цывілізацыйны падыходы да вывучэння гісторыі. Прадмет вывучэння гісторыі Беларусі ў кантэксце цывілізацыйнага развіцця як складовай часткі ўсходнеславянскай і агульнаеўрапейскай гісторыі. Айчынныя гістарыяграфічныя школы. Агульная характарыстыка асноўных крыніц і гістарыяграфіі.

## Раздзел 2. ПЕРШАБЫТНАЕ ГРАМАДСТВА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (100 тысяч гадоў да н.э. – V ст. н.э.)

### Тэма 2.1. Старажытны чалавек на тэрыторыі Беларусі

Гістарыяграфія пытання. Пачатак засялення чалавекам тэрыторыі сучаснай Беларусі. Аблічча, умовы жыцця, прылады працы і заняткі. Асноўныя археалагічныя культуры эпохі каменнага і бронзавага вякоў. Шлюбна-сямейныя адносіны і грамадскі лад. Распад радавой абшчыны і станаўленне суседскай. Насельніцтва Беларусі ў жалезным веку. Распад індаеўрапейцаў. Асноўныя раёны пражывання балтаў, славян, германцаў і іншых народаў. Сацыяльна-эканамічнае развіццё плямёнаў эпохі жалеза. Змены ў гаспадарцы, матэрыяльнай і духоўнай культуры.

### Тэма 2.2. Культура, быт і звычаі старажытных людзей на тэрыторыі Беларусі.

Гістарыяграфія пытання. Сувязь творчай дзейнасці з працай чалавека, кліматычнымі і геаграфічнымі ўмовамі, спосабамі гаспадарання, сацыяльным асяроддзем, філасофскімі і рэлігійнымі ўяўленнямі. Сінкрэтызм першабытнай культуры. Узнікненне веры старажытных людзей у звышнатуральныя ўласцівасці неадушаўлёных прадметаў. Фантастычныя ўяўленні аб роднасці груп людзей з татэмамі – пэўным відам жывёл, раслін і прыродных з’яў. Разнастайнасць і разгалінаванасць паганства. Вера балтаў і ранніх славян у існаванне шматлікіх багоў. Сонечны культ і культ агню. Персанажы народнай дэманалогіі. Вербальная і невербальная магія, замовы, праклёны. Ушанаванне продкаў, пахавальныя рытуалы, памінкі. Музычныя інструменты, мастацкія вырабы і ўпрыгожванні. Арнаментнае аздабленне глінянага посуду і прылад працы. Старажытная скульптура Беларусі. Керамічныя рэльефныя ўзоры. Характар і традыцыі выяўленчага мастацтва Беларусі ў старажытнасці.

## Раздзел 3. БЕЛАРУСЬ У VI – СЯРЭДЗІНЕ XIII ст.

Тэрмін “сярэднявечча”, яго сэнс. Храналагічныя рамкі. Нераўнамернасць развіцця сярэднявяковых цывілізацый. Гістарыяграфія і аналіз крыніц.

**Тэма 3.1. Балты і славяне ў VI – VIII стст.**

"Вялікае перасяленне" народаў у Еўропе і насельніцтва Беларусі. Банцараўская, калочынская, пражская і іншая археалагічныя культуры. Змешанае пражыванне славян з балтамі. Канчатковы распад патрыярхальнага роду. Заняткі насельніцтва, рэлігійныя вераванні, пахавальныя абрады. Ваенная дэмакратыя і зародкі дзяржаўнасці ў славян.

**Тэма 3.2. Узнікненне класавага шматукладнага грамадства ў IX – першай палове XIII ст.**

Аб'яднанні крывічаў-палачан, дрыгавічоў, радзімічаў. Плямёны яцвягаў, літоўцаў у Верхнім Панямонні. Славянізацыя мясцовага балцкага насельніцтва. Асноўныя канцэпцыі аб паходжанні беларусаў, вялікаросаў, украінцаў. Трансфармацыя радавой абшчыны ў суседскую. Шматукладнае грамадства. Зараджэнне феадалізму. Сінтэзны і бяссінтэзны шляхі развіцця феадалізму. Сельская гаспадарка. Рамяство. Гандаль. Узнікненне гарадоў. Сацыяльная дыферэнцыяцыя насельніцтва. Сяляне-земляробы. Знаць і дружына. Княжацкая ўлада.

**Тэма 3.3. Полацкае княства ў X – першай палове XIII ст.**

Першыя пісьмовыя звесткі аб Полацку. Кіеўская Русь. Узаемаадносіны Полацка з Кіевам і Ноўгарадам. Полацкая дынастыя князёў. Рагвалод. Рагнеда. Захоп Уладзімірам Святаслававічам Полацкай зямлі. Аднаўленне незалежнасці. Полацкі князь Ізяслаў. Узмацненне Полацкага княства ў XI ст. Брачыслаў, Усяслаў Чарадзей. Бітва на Нямізе. Паўстанне ў Кіеве 1068 г. і абранне Усяслава Полацкага вялікім князем кіеўскім. Вяртанне Усяслава ў Полацк. Апошнія спробы кіеўскіх князёў падпарадкаваць Полацк і Менск. Барацьба паміж Полацкам і Менскам у другой палове XII ст. Грамадска-палітычны лад у Полацкай зямлі-княстве. Рысы сярэднявечнай рэспублікі ў Полацку. Гарады Полацкай зямлі. Феадальная раздробленасць. Распад Полацкай зямлі на ўдзельныя княствы (гарады-дзяржавы): Полацкае, Віцебскае, Менскае, Друцкае, Ізяслаўскае, Лагожскае.

**Тэма 3.4. Княствы і гарады на тэрыторыі паўднёвай Беларусі, Пасожжа і Верхняга Панямоння**

Тураўскае княства. Бярэсце – гістарычны цэнтр Сярэдняга Пабужжа. Выдзяленне Драгічына пад Бугам у якасці ўдзельнага княства. Смаленскія крывічы. Узнікненне і развіццё Слаўгарада і Крычава. Мсціслаў і Мсціслаўскае ўдзельнае княства. Узнікненне Гомеля як племяннога цэнтра радзімічаў. Развіццё горада ў Х—ХШ стст. Чачэрск і Рэчыца. Мазыр і Брагін – дрыгавіцкія гарады ў складзе Кіеўскага княства. Беларускія княствы і гарады ў Верхнім Панямонні. Гарады Гародня, Ваўкавыск, Слонім, Наваградак і Наваградская зямля. Пачатак барацьбы з рыцарамі-крыжакамі. Кукенойскае і Герцыкскае княствы - фарпосты Полацкай зямлі ў ніжнім цячэнні Заходняй Дзвіны. Князь Вячка, Уладзімір

Полацкі, Якаў Палачанін, Давыд Гарадзенскі. Перадумовы ўтварэння беларуска-літоўскай дзяржавы. Міндоўг і яго барацьба з галіцка-валынскім княствам за валоданне Верхнім Панямоннем. Узаемаадносіны Міндоўга з Ордэнам і Полацкам. Каранацыя Міндоўга ў Наваградку. Узвышэнне Наваградскага княства. Інтэграцыя насельніцтва Беларусі з суседнімі народамі ў межах адзінай дзяржавы. Дыскусія пра летапісную назву "Літва" і яе этнічнае паходжанне.

**Тэма 3.5. Рэлігія і культура беларускіх зямель у IX – першай палове XIII ст.**

Паганскія вераванні. Прыняццё і распаўсюджванне хрысціянства. Дваяверства. Значэнне прыняцця хрысціянства. Пісьменства. Летапісы і рукапісныя кнігі. Літаратура. Пісьменства па археалагічных помніках. Вусная народная творчасць. Паданні пра Рагнеду і Усяслава Чарадзея. Звычаі і абрады. Народны каляндар. Рэлігійна-асветніцкія дзеячы Беларусі: Еўфрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Клімент Смаляціч, Аўраамій Смаленскі. Манументальнае дойлідства Полацкай зямлі і Панямоння. Абарончае дойлідства XIII ст. Архітэктурныя школы. Манументальны жывапіс. Кніжная графіка. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Развіццё перадумоў фарміравання беларускай народнасці.

## Раздзел 4. ВЯЛІКАЕ КНЯСТВА ЛІТОЎСКАЕ, РУСКАЕ І ЖАМОЙЦКАЕ Ў XIII – XV стст.

Айчынная і замежная гістарыяграфія, аналіз крыніц па гісторыі Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага.

**Тэма 4.1 Унутрыпалітычнае становішча ў другой палове XIII – XV ст.**

Вялікае княства Літоўскае – цэнтр збірання беларускіх і іншых усходнеславянскіх зямель. Барацьба за вялікае княжанне пасля смерці Міндоўга. Палітыка вялікіх князёў Віценя, Гедыміна, Альгерда. Шляхі ўключэння беларускіх зямель у склад Вялікага княства Літоўскага. Дынастычная барацьба ў 70—90-я гады XIV ст. (Кейстут, Ягайла, Андрэй Полацкі, Вітаўт). Крэўская унія. Ліквідацыя ўдзельных княстваў. Стварэнне ваяводстваў. Гарадзельскі прывілей 1413 г. Унутрыпалітычная барацьба пасля смерці Вітаўта. Раскол дзяржавы на Вялікае княства Літоўскае і Вялікае княства Рускае. Вялікакняжацкія прывілеі 1432, 1434 гг. Аб'яднанне дзяржавы Жыгімонтам Кейстутавічам. Абмежаванне вялікакняжацкай улады ў другой палове XV ст. Судзебнік Казіміра 1466 г. – першы збор законаў беларуска-літоўскай дзяржавы. Змова супраць Казіміра (1481 г.) і яе вынікі. Вялікакняжацкі прывілей.

**Тэма 4.2 Знешняя палітыка ВКЛ**

Адносіны Вялікага княства Літоўскага з Маскоўскай дзяржавай, Польшчай, Крымам і Ордэнам. Вільня – адзін з цэнтраў аб'яднання ўсходнеславянскіх зямель. Пашырэнне тэрыторыі Вялікага Княства. Паходы Альгерда на Маскву. Бітва на Сініх Водах (1362 г.) і далучэнне да княства Валыні, Падолля і

Кіеўшчыны. Уніі Вялікага княства Літоўскага з Польшчай. Грунвальдская бітва і яе значэнне.

**Тэма 4.3 Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі**

Сельская гаспадарка і асаблівасці яе развіцця. Становішча сялян. Удасканаленне прылад працы і сістэмы апрацоўкі зямлі. Формы землеўладання. Прывелеі феадалаў. Землекарыстанне і павіннасці сялян. Формы феадальнай залежнасці. Запрыгоньванне сялян. Гарады і мястэчкі. Склад і становішча гарадскога насельніцтва. Магдэбургскае права. Асноўныя заняткі гараджан. Унутраны гандаль і знешнеэканамічныя сувязі. Фарміраванне асноўных класаў – саслоўяў феадальнага грамадства ў ВКЛ – шляхты, сялянства, мяшчанства.

**Тэма 4.4 Фарміраванне беларускай народнасці. Культура Беларусі другой паловы XIII – XV ст.**

Складванне этнічнай тэрыторыі беларусаў. Утварэнне сацыяльна-эканамічнай супольнасці. Народная самасвядомасць. Народнасць і рэлігія. Узнікненне і станаўленне беларускай мовы і яе дзяржаўны статус у Вялікім княстве Літоўскім. Паходжанне назваў “Белая Русь”, “ліцвіны-беларусы”. Мінталітэт беларускага народа. Народная творчасць. Літаратура. Рукапісныя кнігі. Кніжная графіка. Беларускія летапісы. Творчасць Рыгора Цамбалака. Выяўленчае мастацтва. Архітэктура. Этнічныя меншасці. Татарскае і яўрэйскае насельніцтва Беларусі – рассяленне, заняткі, культура. Іншыя народы ў этнічных працэсах на беларускіх землях.

## Раздзел 5. БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў XVI – першай палове XVII ст.

**Тэма 5.1. Сацыяльна-эканамічнае развіццё. Афармленне фальваркава-паншчынай сістэмы**

Стан сельская гаспадаркі. Станаўленне фальварка-паншчыннай сістэмы гаспадарання. Аграрная рэформа 1557 г. і яе сутнасць. Пачатак юрыдычнага афармлення прыгоннага права. Стан гарадоў і эвалюцыя гарадскога жыцця. Унутраны і знешні гандаль. Развіццё рыначных адносін. Гандлёва-эканамічныя сувязі беларускіх зямель з еўрапейскімі краінамі. Узмацненне антыфеадальнай барацьбы. Казацкі рух пад кіраўніцтвам С. Налівайкі. Гарадскія паўстанні.

**Тэма 5.2 Знешняя палітыка ВКЛ**

Абвастрэнне адносін паміж Вялікім княствам Літоўскім і Маскоўскай дзяржавай. Войны Вялікага княства Літоўскага і Вялікага княства Маскоўскага, іх прычыны і вынікі. Набегі крымскіх татар. Адносіны Вялікага княства Літоўскага з Ордэнам і Польшчаю. Лівонская вайна і яе вынікі. Інтэрвенцыя Рэчы Паспалітай у Маскоўскую дзяржаву. Барацьба за Смаленск у 30-я гг. XVII ст.

**Тэма 5.2.1 Люблінская ўнія ў гісторыі Беларусі.**

Адносіны Вялікага княства Літоўскага з Ордэнам і Польшчаю. Лівонская вайна і яе вынікі. Інтэрвенцыя Рэчы Паспалітай у Маскоўскую дзяржаву. Барацьба за Смаленск у 30-я гг. XVII ст.

**Тэма 5.3 Унутрыпалітычнае становішча. Усталяванне шляхецкай дэмакратыі**

Унутрыпалітычная барацьба ў Вялікім княстве Літоўскім у першай палове XVI ст. Праўленне Аляксандра і Жыгімонта I Старога. Абмежаванне ўлады вялікага князя і правоў паноў рады. Мяцеж Міхаіла Глінскага. Адмена Гарадзельскага прывелея. Усталяванне палітычнай талерантнасці. Узрастанне ролі сойма як кіруючага органа дзяржаўнай улады. Статуты 1529, 1566 і 1588 гг. Адміністрацыйна-тэрытарыяльная і судовая рэформы.

**Тэма 5.4 Культура Беларусі ў XVI – першай палове XVII ст.**

Уплыў ідэй Адраджэння на развіццё беларускай культуры. Спецыфічныя рысы беларускага Рэнесансу. Полілінгвізм. Францыск Скарына – беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар-асветнік, гуманіст, вучоны і пісьменнік эпохі Адраджэння. Рэфармацыйнае кнігадрукаванне. Лацінамоўная паэзія. Ян Вісліцкі, Мікола Гусоўскі. Беларуска-літоўскія летапісы, гісторыка-мемуарная і палітычная літаратура. Грамадска-палітычная думка. Сымон Будны, Васіль Цяпінскі, Феадосій Касы. Школа і школьная адукацыя. Праваслаўныя брацтвы. Жывапіс. Скульптура. Мураванае дойлідства. Музыка. Тэатр.

## Раздзел 6. ВОЙНЫ І САЦЫЯЛЬНА-ПАЛІТЫЧНЫЯ КАНФЛІКТЫ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XVII – XVIII ст. САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫ, ПАЛІТЫЧНЫ І КУЛЬТУРНЫ ЗАНЯПАД БЕЛАРУСІ

**Тэма 6.1 Войны сярэдзіны XVII ст.**

Паўстанне пад кіраўніцтвам Б. Хмяльніцкага ва Украіне і яго роля ў разгортванні казацка-сялянскай вайны 1648-1651 гг. у Беларусі. Баявыя дзеянні казацка-сялянскіх атрадаў супраць шляхецкага апалчэння і воскаў наёмнікаў. Антыфеадальны, антыпольскі і антыкаталіцкі характар вайны. Баявыя дзеянні на поўдні і паўднёвым захадзе Беларусі. Вынікі антыфеадальнай барацьбы для Беларусі. Ваенныя дзеянні падчас вайны Расіі з Рэччу Паспалітай у 1654-1667 гг. Адносіны насельніцтва да варагуючых бакоў. Палітыка царызму. Народны рух у другой палове 50 – пачатку 60-х гг. XVII ст. Вызваленне тэрыторый Беларусі. Вынікі вайны для Беларусі.

**Тэма 6.2 Эканамічны заняпад Беларусі ў другой палове XVII – першай палове XVIII ст.**

Стан сельскай гаспадаркі пасля войнаў сярэдзіны XVII – пачатку XVIII ст. Рост магнацкага землеўладання. Катэгорыі сялян і іх становішча. Феадальныя павіннасці і дзяржаўныя падаткі. Гаспадарка селяніна. Супраціўленне сялян

феадальнаму прыгнёту. Паўстанне сялян пад кіраўніцтвам В.Вашчылы ў Крычаўскім старастве (1740 – 1744 гг.). Паўстанне на Каменшчыне ў сярэдзіне XVIII ст. Становішча гарадоў і мястэчак ў другой палове XVII – першай палове XVIII ст. Прычыны заняпаду гарадскога жыцця. Колькасць і структура гарадскіх паселішчаў і гарадскога насельніцтва. Рамесная вытворчасць і гарадскі гандаль. Гандлёвыя сувязі. Самакіраванне. Грамадска-палітычнае жыццё і ўзмацненне нацыянальна-рэлігійнага прыгнёту. Сацыяльная барацьба гараджан Беларусі.

**Тэма 6.3 Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў другой палове XVIII ст.**

Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя ўмовы развіцця сельскай гаспадаркі. Шырокае распаўсюджванне фальваркава-паншчыннай сістэмы гаспадарання і панаванне ў эканоміцы буйных феадалаў. Нізкія тэмпы развіцця промыслаў і сельскага рамяства. Вотчынная мануфактура і яе роля ў эканоміцы. Сялянская гаспадарка і становішча сялян. Рост беларускіх гарадоў і іх насельніцтва. Крыніцы росту. Мястэчкі. Развіццё гарадскога рамяства і фабрычна-мануфактурнай прамысловасці. Сельскагаспадарчыя заняткі гараджан. Адсутнасць у Беларусі значных капіталаў і вузкасць унутранага рынку. Прычыны нізкіх тэмпаў развіцця эканомікі Беларусі ў другой палове XVIII ст.

**Тэма 6.4 Палітычны крызіс Рэчы Паспалітай. Далучэнне Беларусі да Расійскай імперыі**

Гістарыяграфія пытання. Разлад дзяржаўнай сістэмы кіравання ў Рэчы Паспалітай. Падзеі Паўночнай вайны ў Беларусі. Новыя спусташэнні і цяжкія людскія страты. Паслабленне каралеўскай улады і ўзмацненне феадальнай анархіі. Права “Ліберум вета” і недзеяздольнасць сойма. Роля павятовых і ваяводскіх соймікаў. Умяшанне Расіі, Аўстрыі, Францыі і Прусіі ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай. Дысідэнты. Торуньская, Слуцкая, Барская канфедэрацыі. Разгром барскіх канфедэратаў у верасні 1771 г. рускімі войскамі. Першы падзел Рэчы Паспалітай. Сацыяльна-эканамічныя рэформы апошняй чвэрці XVIII ст. у Рэчы Паспалітай. Чатырохгадовы сойм. Прыняцце новай канстытуцыі 3 мая 1791 г. і яе значэнне. Стварэнне таргавіцкай канфедэрацыі і ліквідацыя рэформаў і канстытуцыі 1791 г. Другі падзел Рэчы Паспалітай (1793 г.). Паўстанне 1794 г. пад кіраўніцтвам Т.Касцюшкі. Ход паўстання ў Беларусі. Я.Ясінскі, М.Агінскі. Падаўленне паўстання. Трэці падзел Рэчы Паспалітай 1795 г. Ліквідацыя Рэчы Паспалітай як самастойнай дзяржавы.

**Тэма 6.5 Культура Беларусі ў другой палове XVII – XVIII ст.**

Гістарычныя ўмовы культурнага развіцця беларускага народа. Узмацненне каталіцкай рэакцыі. Грамадска-палітычная думка. А. Філіповіч, К. Лышчынскі, І. Капіевіч, Г. Каніскі. Стан асветы і спроба яе рэфарміравання. Літаратура: М. Сматрыцкі, С. Полацкі. Музыка і тэатр. Школны тэатр. Батлейка. Прыгонны тэатр. Архітэктура. Панавнне стылю барока. “Віленскае барока”. Зараджэнне ў мураваным дойлідстве стылю класіцызму. Выяўленчае мастацтва. Фрэскавы жывапіс. Графіка. Скульптура. Дзейнасць беларускіх майстроў у Маскве.

Мастацкая апрацоўка металу. Развіццё дэкаратыўнай кафлі. Мастацкае шкло: налібоцкая і ўрэцкая мануфактуры, іх вырабы. Ювелірнае мастацтва. Ткацтва, вышыўка, карункі, дываны. “Слуцкія паясы” – каштоўны ўклад у еўрапейскае ткацкае мастацтва.

**Тэма 6.6 Беларуская народнасць у XVII – XVIII стст.**

Гістарыяграфія пытання. Этнічная тэрыторыя і структура беларускага насельніцтва. Этнічная свядомасць і рэлігія. Паступовы заняпад беларускасці, напрамкі і вынікі гэтага працэсу. Фальклярызацыя беларускай культуры. Матэрыяльная культура беларусаў. Быт, вераванні, звычаі, мараль, традыцыі. Характар беларусаў. Менталітэт беларусаў. Уплыў войнаў і сацыяльна-палітычных канфліктаў на этнасацыяльнае развіццё беларусаў. Іншыя народы і іх уплыў на этнічныя працэсы ў Беларусі. Захаванне патэнцыялу для развіцця нацыі.

## Раздзел 7. КРЫЗІС ПРЫГОННІЦКАЙ СІСТЭМЫ (канец XVIII – першая палова XIX ст.)

**Тэма 7.1 Палітыка царызму на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XIX ст.**

Тэрытарыяльна-адміністрацыйныя падзелы Беларусі і новая адміністрацыя. Органы кіравання і суда. Ліквідацыя феадальнай анархіі. Захаванне правоў і прывілеяў шляхты Беларусі. Раздача беларускіх зямель рускім памешчыкам. Становішча сялян. Падаткі і павіннасці. “Дарчая грамата гарадам” 1785 г. і адмена юрысдыкцыі свецкіх і царкоўных феадалаў у адносінах да пражываючых на землях гараджан. “Мяжа яўрэйскай аседласці” і яе роля ў развіцці гарадоў. Адносіны царызму да уніяцкай і каталіцкай канфесій, дзейнасць езуітаў. Сацыяльна-эканамічныя мерапрыемствы. Палітыка царызму ў галіне духоўнай культуры і асветы. Праект аднаўлення Вялікага княства Літоўскага.

**Тэма 7.2 Вайна 1812 г. на тэрыторыі Беларусі**

Пачатак вайны. Мабілізацыя беларусаў у Расійскую армію. Адступленне рускіх армій і баявыя дзеянні на тэрыторыі Беларусі летам 1812 г. Акупацыя Беларусі войскамі Напалеона. Акупацыйны рэжым. Пазіцыі магнатаў і шляхты. Дзейнасць Камісіі Часовага праўлення Вялікага княства Літоўскага. Рабаванне насельніцтва Беларусі. Падтрымка акупантамі прыгонніцкіх парадкаў. Партызанскі рух. Барацьба супраць акупантаў і мясцовых памешчыкаў. Адступленне французаў з Масквы. Ваенныя падзеі на тэрыторыі Беларусі восенню 1812 г. Вызваленне Полацка, Віцебска, бітва за мястэчка Чашнікі. Разгром французскага войска на Бярэзіне. Вызваленне Беларусі ад захопнікаў у канцы снежня 1812 г. Разарэнне краю ў ходзе вайны.

**Тэма 7.3 Грамадска-палітычны рух. Паўстанне 1830 – 1831 гг.**

Уздзеянне на Беларусь грамадска-палітычных падзей у Расіі і польскага нацыянальна-вызваленчага руху. Віленскі універсітэт як цэнтр польскага апазіцыйнага і рэвалюцыйна-шляхецкага руху. “Таварыства філаматаў” (Адам

Міцкевіч, Тамаш Зан, Ян Чачот, Юзэф Яжоўскі). Дзейнасць "Таварыства аматараў навук". Дзекабрысты ў Беларусі. Тайнае "Палітычнае таварыства" і яго дзейнасць. "Таварыства ваенных сяброў" у Асобным літоўскім корпусе (Гродзенская губерня). Разгром тайных таварystваў. Паўстанне 1830 – 1831 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі. Праграма кіраўнікоў паўстання. Ход баявых дзеянняў. Падаўленне паўстання і яго значэнне.

**Тэма 7.4 Змена палітыкі самадзяржаўя ў Беларусі**

Спробы раскалоць польскі нацыянальна-вызваленчы рух і антыфеадальную барацьбу сялян. Увядзенне "Правілаў аб аддачы сялян па найму ў зямельныя і іншыя чорныя работы", люстрацыі казённых маёнткаў і інвентарызацыі маёнткаў памешчыкаў. Курс на русіфікацыю Беларусі. Насаджэнне рускага землеўладання і чыноўніцтва. "Разбор шляхты". Закрыццё Віленскага універсітэта. "Асобны камітэт па справах заходніх губерняў". Падрыхтоўка ліквідацыі уніяцкай царквы. Полацкі царкоўны сабор і яго рашэнні. Супраціўленне ніжэйшага уніяцкага духавенства. Знішчэнне уніяцкіх кніг і царкоўнай маёмасці. Адмена дзеяння ў Беларусі і Літве Статута Вялікага княства Літоўскага 1588 г. Увядзенне расійскага заканадаўства. Забарона назваў "Беларусь" і "Літва" ў афіцыйнай дакументацыі.

**Тэма 7.5 Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст.**

Сельская гаспадарка. Развіццё фальваркава-паншчыннай сістэмы. Панаванне ў эканоміцы буйных феадалаў. Рост паншчыны і іншых павіннасцяў. Пачатак спецыялізацыі сельскай гаспадаркі. Павелічэнне таварнасці сельскагаспадарчай вытворчасці. Рост ужывання наёмнай працы. Прамысловасць. Вотчынныя, мястэчковыя і гарадскія прадпрыемствы. Рамёствы, мануфактуры, фабрыкі. Прымусовы і вольны наём. Галіновая структура прамысловасці. Рост гарадоў і мястэчак. Колькасць, саслоўны і нацыянальна-канфесійны склад гарадскога насельніцтва. Органы гарадскога самакіравання. Важнейшыя гандлёвыя шляхі і кірмашы. Вузкасць унутранага рынку. Фінансы. Слабасць капіталаў беларускіх гандляроў. Рэформа Кісялёва. Спробы рэгулявання ўзаемаадносін памешчыкаў і сялян паводле "Інвентарнай рэформы". Няўдача рэформы. Паншчынная сістэма як тормаз развіцця сельскай гаспадаркі, прамысловасці і гарадоў. Грамадска-палітычны рух у 30 – 50-я гады. Зараджэнне рэвалюцыйна-дэмакратычнай плыні. "Дэмакратычнае таварыства". Францішак Савіч. Неабходнасць адмены прыгоннага права.

**Тэма 7.6 Асвета і культура Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст.**

Палітыка царызму ў галіне культуры. Непрызнанне існавання беларускага этнасу, яго мовы і культуры. Адукацыя. Тыпы школ і іх колькасць. Узмацненне паланізацыі ў сістэме народнай асветы. Полацкая езуіцкая акадэмія. Віленскі універсітэт як цэнтр адукацыі і навукі ў Беларусі і Літве. Узмацненне цікавасці да гісторыі, быту і культуры беларускага народа. Этнаграфічныя і гістарычныя даследаванні. Горы-Горацкі земляробчы інстытут. Кнігавыдавецкая дзейнасць.

Перыядычны друк. Грамадска-палітычная думка. Русіфікацыя сістэмы народнай адукацыі пасля падаўлення паўстання 1830 – 1831 гг. Літаратура. Беларускі фальклор. Паэмы "Энеіда навыварат" і "Тарас на Парнасе". Беларускія матывы ў творчасці А. Міцкевіча. Беларуская плынь у польскамоўнай "краёвай" літаратуры. Ян Чачот, Ян Баршчэўскі, Уладзімір Сыракомля. Музыка і тэатр. Збіранне і вывучэнне беларускай народнай песні. З'яўленне опернага мастацтва ў Беларусі. Станіслаў Манюшка. З'яўленне прафесійнай беларускай драматургіі. В.Дунін-Марцінкевіч. Архітэктура. Панаванне класіцызму з канца XVIII ст. Выяўленчае мастацтва. Партрэт, пейзаж, бытавы жанр. Гістарычны жывапіс і манументальна-дэкаратыўны жывапіс. Графіка. Росквіт народнага лубка. Творчасць гравёраў. Скульптура. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Развіццё мануфактурнай вытворчасці. Слуцкія паясы. Беларускае шкло. Выспяванне беларускай нацыянальнай ідэі.

## Раздзел 8. СТАНАЎЛЕННЕ БУРЖУАЗНАГА ГРАМАДСТВА Ў БЕЛАРУСІ. ФАРМІРАВАННЕ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫІ (1861 – 1900 гг.)

### Тэма 8.1 Буржуазныя рэформы і асаблівасці іх правядзення ў Беларусі. Стан гаспадаркі ў другой палове XIX ст.

Гістарыяграфія пытання. Адмена прыгоннага права. Маніфест і "Палажэнні" 19 лютага 1861 г. Спецыфіка мясцовых "Палажэнняў" для Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай, Гродзенскай і Віленскай губерняў. Новы парадак кіравання сялянамі. Правы сялян. Умовы надзялення іх зямлёю. "Часоваабавязанае становішча". Уздым сялянскага руху. Змены ў рэалізацыі рэформы, звязаныя з паўстаннем 1863 г. Рэформы аграрных адносін дзяржаўных сялян і іншых катэгорый сельскага насельніцтва. Вынікі і значэнне сялянска-аграрных рэформ. Ваенная, земская, судовая, гарадская, цэнзурная, школьная рэформы. Буржуазная сутнасць рэформ, іх непаслядоўнасць і абмежаванасць. Развіццё сельскай гаспадаркі. Паглыбленне крызісу памешчыцкай гаспадаркі. Скарачэнне дваранскага землеўладання і рост бессаслоўнай зямельнай уласнасці. Аграрны крызіс 80-х гадоў і яго ўплыў на спецыялізацыю сельскай гаспадаркі. Галоўныя накірункі спецыялізацыі. Транспарт, гандаль і крэдыт. Будаўніцтва чыгунак. Дзейнасць банкаў у Беларусі. Абмежаванні ў адносінах да памешчыкаў "польскага паходжання". Развіццё прамысловасці і рост гарадоў. Спецыялізацыя беларускай прамысловасці. Яе галіновая структура. Высокая ўдзельная вага дробнай вытворчасці. Замаруджаныя тэмпы пераходу да машыннай вытворчасці (фабрыкі). Прамысловае развіццё гарадоў і мястэчак. Прамысловасць у сельскай мясцовасці.

### Тэма 8.2 Вызваленчая барацьба на беларускіх землях у другой палове XIX ст.

Гістарыяграфія пытання. Паўстанне 1863 – 1864 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі. Рэвалюцыйныя дэмакраты і шляхецкія рэвалюцыянеры. К.Каліноўскі. Літоўскі правінцыяльны камітэт (ЛПК). "Чырвоныя" і "белыя". "Мужыцкая

праўда”. Узаемаадносіны ЛПК і Варшаўскага Цэнтральнага камітэта. М.М. Мураўёў і яго дзейнасць у краі. Падаўленне паўстання. Вынікі і значэнне паўстання. Сялянскі і рабочы рух. Народніцкія гурткі ў Беларусі. Характар і асаблівасці народніцтва 80 – 90-х гадоў у Беларусі. Ідэйна-арганізацыйны крызіс народніцтва. Пачатак прапаганды марксізму ў Беларусі. Першыя сацыял-дэмакратычныя гурткі. 1 з’езд РСДРП. Утварэнне “Рабочага саюза Літвы” і Бунда. “Рабочая партыя палітычнага вызвалення Расіі”. Утварэнне сацыял-дэмакратыі Каралеўства Польскага і Літвы. Уздым рабочага руху ў другой палове 90-х гадоў. Асноўныя патрабаванні рабочых. Першыя палітычныя выступленні рабочых.

**Тэма 8.3 Фарміраванне беларускай нацыі. Культура Беларусі ў 60 – 90 гады XIX ст.**

Гістарыяграфія пытання. Гістарычныя ўмовы развіцця беларускай культуры ў другой палове XIX ст. і ўтварэнне беларускай нацыі. Этнічная тэрыторыя беларусаў, нацыянальны склад насельніцтва па губернях і паветах. Асаблівасці саслоўнага і рэлігійнага складу, заняткаў беларускага, рускага, польскага, яўрэйскага і татарскага насельніцтва Беларусі, яго размяшчэнне ў гарадах і сельскай мясцовасці. Развіццё капіталістычнага рынку. Паступовы распад саслоўнай структуры. Фарміраванне і нацыянальны склад пралетарыяту і буржуазіі. Слабасць эканамічных пазіцый беларускай нацыянальнай буржуазіі. Фарміраванне агульных нацыянальных прыкмет. Этнічная і нацыянальная самасвядомасць. Станаўленне беларускай літературнай мовы. Развіццё мастацкай літаратуры. Творчасць Ф. Багушэвіча, А. Гурыновіча, Я. Лучыны, К. Каганца і інш. Студэнцкія арганізацыі ў Пецярбургу і Маскве. Рост легальных публікацый на беларускай мове ў 90-я гады. Асаблівасці нацыянальна-культурнага руху. Асвета. Пачатковая і сярэдняя адукацыя. Афіцыйны друк. Газета “Мінскі лісток”. Прапаганда ідэалогіі “заходнерусізму”. Беларускі фальклор. Быт і матэрыяльная культура, звычаі, абрады, нормы маралі народаў Беларусі. Этнаграфічныя і гістарычныя даследаванні. Музыка і тэатр. Градабудаўніцтва і архітэктура. Жывапіс. Вядучая роля гістарычнага жанру. Развіццё бытавога жанру, краявіду і партрэта. Шматнацыянальны характар культуры ў Беларусі.

## Раздзел 9. БЕЛАРУСЬ У ПАЧАТКУ XX ст. (1901 – 1914 гг.)

**Тэма 9.1 Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў пачатку XX ст.**

Гістарыяграфія пытання. Развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы. Феадальна-прыгонніцкія перажыткі. Эміграцыя. Перапляценне капіталістычных і прыгонніцкіх формаў эксплуатацыі. Сацыяльныя і нацыянальныя працэсы ў Беларусі да рэвалюцыі 1905 – 1907 гг. Сацыяльная структура насельніцтва. Эканамічная палітыка царызму ў Беларусі. Развіццё прамысловасці. Эканамічны крызіс (1900 – 1903 гг.). Структура і характар прамысловасці ў пачатку XX ст. Пранікненне буйнога капіталу. Прамысловыя таварыствы і іх роля ва ўмацаванні цэнтралізацыі капіталу ў прамысловасці. Павелічэнне колькасці рабочага класу. Нацыянальны і сацыяльны склад рабочага класу Беларусі і яго становішча. Уздым рабочага і сялянскага руху.

### Тэма 9.2 Рэвалюцыя 1905 – 1907 гг. у Беларусі

Гістарыяграфія пытання. Абвастрэнне сацыяльных супярэчнасцяў і нацыянальнага пытання. "Паліцэйскі сацыялізм". Яўрэйская незалежная рабочая партыя. Сацыял-дэмакратычныя арганізацыі. Арганізацыя партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў і Польскай партыі сацыялістычнай на Літве. Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух. Утварэнне Беларускай сацыялістычнай грамады. Пачатак рэвалюцыі: рэвалюцыйны рух у студзені – верасні 1905 г. Вяснова-летні ўздым палітычных выступленняў і эканамічнай барацьбы рабочых. Уплыў рабочага руху на сялянства. Новыя формы сялянскага руху. Салдацкія выступленні. Адносіны палітычных партый, насельніцтва Беларусі да ўказа аб скліканні Булыгінскай думы. Кастрычніцкая палітычная стачка ў гарадах і мястэчках Беларусі. Маніфест 17 кастрычніка і рэпрэсіі царызму. Курлоўскі расстрэл у Мінску. Дыферэнцыяцыя грамадска-палітычных сіл. Буржуазна-ліберальны рух і яго асаблівасці ў заходніх губернях. Снежаньская палітычная стачка ў Беларусі. Адступленне рэвалюцыі. Дэпутаты Беларусі ў I і II Дзяржаўных думах. Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух у перыяд рэвалюцыі 1905 – 1907 гг. Дзейнасць БСГ, яе лозунгі і патрабаванні ў 1905 г. II з'езд БСГ. Змены ў праграме руху. Рэвалюцыйна-дэмакратычны характар газеты "Наша доля". Агульная характарыстыка дзейнасці БСГ у перыяд рэвалюцыі. Сацыялістычная партыя Беларусі.

### Тэма 9.3 Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі. Сталыпінскія рэформы

Развіццё прамысловасці. Прамысловы ўздым. Рост акцыянернага капіталу і далейшая спецыялізацыя прамысловасці. Асаблівасці прамысловасці Беларусі. Аграрная рэформа і развіццё сельскай гаспадаркі. Мэты сталыпінскай аграрнай рэформы. Разбурэнне сялянскай абшчыны, насаджэнне хутароў. Узмацненне агранамічнага, заатэхнічнага, ветэрынарнага, тэхнічнага абслугоўвання вёскі. Арганізацыя перасялення сялян у азіяцкую Расію. Вынікі і значэнне рэформы. Грамадскі рух у перыяд наступлення рэакцыі. Увядзенне земстваў. Выбарчы закон ад 3 чэрвеня 1907 г. і яго асаблівасці ў Беларусі. Трэцячэрвеньская палітычная сістэма. Спецыфіка ліберальнага руху ў Беларусі. Палітычныя пазіцыі ўрадавых партый і арганізацый. Асаблівасці рабочага руху на тэрыторыі Беларусі ў 1911 – 1913 гг. Дынаміка сялянскага руху. Значэнне ўвядзення выбарных земстваў у Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губернях. Грамадска-палітычны рух падчас выбараў у IV Думу. Дэпутаты ад заходніх губерняў у Думе. Утварэнне Прагрэсіўнага блока. Беларускі нацыянальны вызваленчы рух у 1907 – 1914 гг. Гуртаванне беларускіх нацыянальных дзеячаў вакол "Нашай нівы".

## Раздзел 10. БЕЛАРУСЬ У ГАДЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (1914 – 1918 гг.)

### Тэма 10.1 Першая сусветная вайна на тэрыторыі Беларусі (1914 – 1916 гг.)

Гістарыяграфія пытання. Пачатак вайны. Увядзенне ваеннага становішча ў беларускіх губернях. Мабілізацыйныя мерапрыемствы. Адносіны да вайны

розных слаёў насельніцтва, палітычных і грамадскіх арганізацый, газеты "Наша Ніва". Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі ў 1915 – 1916 гг. Нямецкі акупацыйны рэжым. Дзейнасць "Беларускага камітэта дапамогі ахвярам вайны" на тэрыторыі, акупаванай немцамі. Беларускае школьніцтва, культурна-асветніцкая справа ва ўмовах нямецкай акупацыі ў 1915 – 1917 гг. Беларускі народны камітэт і Цэнтральны саюз беларускіх нацыянальных грамадскіх арганізацый. Стварэнне Беларускай сацыял-дэмакратычнай рабочай групы. Заснаванне "Канфедэрацыі Вялікага княства Літоўскага". Становішча на беларускіх землях у складзе Расійскай дзяржавы падчас першай сусветнай вайны. Заняпад сельскай гаспадаркі. Змены ў складзе насельніцтва. Размяшчэнне войскаў і органаў іх кіравання. Бежанства ў Беларусі. Стварэнне "камітэтаў дапамогі ахвярам вайны" і іх дзейнасць. Узмацненне сацыяльнай напружанасці ў 1915 – 1916 гг. Паўстанне салдат на Гомельскім размеркавальным пункце. Пачатак разлажэння арміі, рост дэзерцірства.

**Тэма 10.2 Культура Беларусі ў пачатку ХХ ст.**

Узмацненне шавінізму ў палітыцы царызму, барацьба з беларускім адраджэннем. Ідэалогія і практыка "заходне-русізма". Барацьба польскіх нацыяналістычных груповак з беларускім нацыянальным рухам. Газета "Наша Ніва" – цэнтр адраджэнцкага руху. Барацьба за адраджэнне і развіццё нацыянальнай мовы. Роля "Нашай Нівы" ў развіцці нацыянальнай літаратуры, друку, фарміраванні нацыянальнай беларускай інтэлігенцыі. Адукацыя. Школьная справа ў Беларусі на пачатку ХХ ст. Прафесійна-тэхнічнае навучанне. Стварэнне беларускай нацыянальнай школы. Арганізацыя падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў. Стварэнне падручнікаў для нацыянальнай школы. Навуковыя даследаванні мовы, этнаграфіі і гісторыі Беларусі. Якасныя зрухі ў развіцці беларускай мастацкай літаратуры, нацыянальнай драматургіі, літаратурнай крытыкі і публіцыстыкі. Беларускія пісьменнікі: Я.Купала, Я.Колас, М.Багдановіч, Цётка, К.Каганец, Ц.Гартны, З.Бядуля, М.Гарэцкі. Асаблівасці беларускай літаратуры нашаніўскага перыяду. Развіццё перыядычнага друку і кнігадрукавання. Беларускія газеты. Беларускія выдавецтвы. Станаўленне беларускага прафесійнага тэатра. Развіццё і папулярызацыя беларускай народнай музыкі і песні. Драўлянае дойлідства. Жывапіс. Пераважнае развіццё жанру краявіду. Развіццё бытавога жанру. Разнастайнасць і супярэчлівасць выяўленчага мастацтва ў рэвалюцыйны час. Графіка. Пластыка і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Шматнацыянальны характар культуры Беларусі.

**Тэма 10.3 Беларусь пасля падзення самадзяржаўя (сакавік – кастрычнік 1917 г.)**

Гістарыяграфія пытання. Асаблівасці эканамічнага, ваеннага і палітычнага становішча ў Беларусі ў пачатку 1917 г. Лютаўская рэвалюцыя ў Беларусі. Змены органаў улады. Стварэнне Часовых грамадскіх камітэтаў парадку, назначэнне камісараў Часовага ўрада, выбары валасных, гарадскіх і павятовых камітэтаў. Утварэнне Саветаў рабочых і сялянскіх дэпутатаў у Беларусі. Стварэнне салдацкіх камітэтаў у войсках Заходняга фронту і іх уплыў на становішча ў

Беларусі. Першы з'езд ваенных і рабочых дэпутатаў арміі і тылу Заходняга фронту і яго адносіны да пытання аб вайне, да палітыкі Часовага ўрада. З'езды сялянскіх дэпутатаў, адносіны да ваеннага і аграрнага пытанняў. Арганізацыя прафесійных саюзаў рабочых і служачых. Уздым грамадска-палітычнай актыўнасці насельніцтва Беларусі. Палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі пасля падзення самаўладдзя. Пазіцыі асноўных партый (кадэтаў, акцябрыстаў, сацыял-дэмакратаў, сацыялістаў-рэвалюцыянераў) па аграрным і нацыянальным пытаннях.

**Тэма 10.4 Беларускі нацыянальны рух пасля падзення самадзяржаўя**

Гістарыяграфія пытання. Аднаўленне дзейнасці БСГ, яе арганізацый у гарадах Беларусі, Расіі, у арміі і на флоце. Канферэнцыя ў сакавіку 1917 г. Адносіны БСГ да Часовага ўрада, аўтаноміі Беларусі. Канферэнцыя БСГ у чэрвені 1917 г., абмеркаванне праекта новай праграмы БСГ, абранне часовага ЦК БСГ. З'езд прадстаўнікоў беларускіх нацыянальных арганізацый у Мінску 25 – 27 сакавіка 1917 г. Рашэнні з'езда па пытаннях аўтаноміі Беларусі, вызначэння яе тэрыторыі, арганізацыі культурна-асветніцкай працы. Утварэнне Беларускага нацыянальнага камітэта (БНК), яго склад і дзейнасць. Адносіны Часовага ўрада да набыцця Беларуссю аўтаноміі. З'езд прадстаўнікоў беларускіх партыйных і грамадскіх арганізацый 8 – 10 ліпеня 1917 г. Барацьба БСГ за лідэрства сярод беларускіх арганізацый. Абранне Цэнтральнай Рады беларускіх арганізацый (ЦРБА). Дзейнасць ЦРБА. ІІІ з'езд Беларускай сацыялістычнай Грамады. Прыняцце новай праграмы БСГ. ІІ сесія ЦРБА, пераўтварэнне яе ў Вялікую Беларускую Раду (ВБР). Заснаванне Цэнтральнай беларускай вайсковай Рады (ЦБВР). Газета "Вольная Беларусь". Стварэнне Беларускай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі, яе платформа. Беларускі абласны камітэт пры ўсерасійскім Савеце сялянскіх дэпутатаў (БАК).

**Тэма 10.5 Кастрычніцкая рэвалюцыя на Беларусі**

Гістарыяграфія пытання. Рэвалюцыйныя падзеі ў Петраградзе і іх водгук на тэрыторыі Беларусі.Стварэнне ваенна-рэвалюцыйнага Камітэта (ВРК) Заходняй вобласці і фронту. Ліквідацыя органаў Часовага ўраду і арганізацыя савецкай улады на месцах. Барацьба за ўсталяванне савецкай улады ў Мінску. Мінскі савет. Камітэт выратавання рэвалюцыі. Дапамога Заходняга фронта ва ўсталяванні савецкай улады ў Мінску. Усталяванне савецкай улады ў іншых гарадах Беларусі. Пазіцыя беларускіх нацыянальных партый да ўсталявання савецкай улады. Утварэнне Аблвыканкамзаха, стварэнне СНК Заходняй вобласці, савецкіх органаў кіравання на месцах. Першыя палітычныя, эканамічныя і сацыяльныя пераўтварэнні Савецкай улады. Байкот мерапрыемстваў савецкай улады і барацьба з імі ВРК. Ажыццяўленне Дэкрэта аб міры на Заходнім фронце. Адносіны савецкай улады да нацыянальнага пытання і нацыянальнага руху ў Беларусі. Адкрыццё ўсебеларускага з'езда (кангрэса) у снежні 1917 г. Склад яго ўдзельнікаў, вызначэнне парадку дня, асноўных поглядаў на лёс Беларусі. Адносіны ўсебеларускага з'езда да ўлады Саветаў, мясцовых органаў савецкай

улады. Разгон Усебеларускага кангрэса. Утварэнне Выканкама ўсебеларускага з'езда.

### Тэма 10.6 Мяцеж польскага корпуса Доўбар-Мусніцкага. Ваенная інтэрвенцыя Германіі

Гістарыяграфія пытання. Палітычныя мэты мяцяжу, яго тэрыторыя. Адносіны беларускага насельніцтва да польскіх легіянераў. Партызанская барацьба. Мерапрыемствы Савецкай улады па падаўленні мяцяжу. Ваенныя дзеянні супраць корпуса Доўбар-Мусніцкага. Сувязь польскіх легіянераў з нямецкімі войскамі. Наступленне нямецкіх войскаў у пачатку 1918 г. Захоп новых тэрыторый Беларусі. Спробы Савецкай улады арганізаваць супраціўленне нямецкаму наступу. Вынікі Брэсцкага міру для Беларусі. Нямецкі акупацыйны рэжым на захопленай тэрыторыі Беларусі, адносіны да яго насельніцтва. Партызанская і падпольная барацьба супраць нямецкіх акупантаў у 1918 г. Заканчэнне першай сусветнай вайны. Скасаванне Брэсцкага дагавору. Наступленне Чырвонай Арміі, вызваленне тэрыторыі Беларусі ад нямецкіх войскаў. Беларускае пытанне падчас афармлення Версальскай сістэмы.

### Тэма 10.7 Беларуская Народная Рэспубліка

Гістарыяграфія пытання. Прыняцце Выканкамам Усебеларускага з'езда Першай Устаўной Граматы. Стварэнне Народнага Сакратарыята на чале з І.Варонкам. Другая ўстаўная Грамата, яе змест. Абвяшчэнне Беларускай народнай Рэспублікі (БНР). Рада БНР, яе склад і дзейнасць. Трэцяя ўстаўная Грамата, абвяшчэнне незалежнасці БНР. Адносіны БНР і германскіх улад. Палітычны крызіс БНР. Раскол у БСГ. Утварэнне Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (БСДП), Беларускай партыі сацыялістаў-федэралістаў (БПСФ), Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў. Пазіцыі беларускіх нацыянальных партый па сацыяльна-эканамічных, аграрных і нацыянальных пытаннях. Барацьба за міжнароднае прызнанне БНР, адносіны да яе насельніцтва Беларусі, акупацыйных нямецкіх і савецкіх улад. Грамадска-палітычныя дзеячы беларускага адраджэнцкага руху. Гістарычнае месца БНР у працэсе стварэння беларускай дзяржаўнасці.

## Раздзел 11. БЕЛАРУСЬ ПАМІЖ ДЗВЮМА СУСВЕТНЫМІ ВОЙНАМІ (1919 – 1939 гг.)

### Тэма 11.1 Утварэнне БССР

Гістарыяграфія пытання. Палітычныя перадумовы стварэння беларускай савецкай дзяржаўнасці. Роля Беларускага нацыянальнага камісарыята (Белнацкама) пры Наркамаце па справах нацыянальнасцяў РСФСР і беларускіх секцый ў РКП(б). Пазіцыя па беларускім пытанні Аблвыканкамзаха і Паўночна-заходняга абласнога камітэта РКП(б). Супярэчнасці працэсу станаўлення беларускай савецкай дзяржаўнасці. Прыняцце вышэйшымі партыйнымі органамі рашэння аб стварэнні БССР. VI абласная канферэнцыя бальшавіцкай партыі.

